**Мазуркевіч Л.М. (Мазыр)**

## Зваротак у вершах Максіма Танка

Паэтычныя радкі, створаныя Максімам Танкам, вызначаюцца надзвычай тонкім адчуваннем слова, уважлівым стаўленнем аўтара да выбару моўных сродкаў мастацкай выразнасці. Як адзначае мовазнаўца А.А. Каўрус, свежасць і самабытнасць паэтычнага голасу Максіма Танка абумоўлена арыгінальнай тэматыкай твораў, нестандартнасцю яе мастацкай распрацоўкі, грунтоўнай літаратурнай і моўнай дасведчанасцю [3, с. 554].

Адметным сродкам паэтычнага сінтаксісу вершаў Максіма Танка, акрамя іншых, выступае зваротак. У беларускім (рускім) мовазнаўстве па-рознаму вызначаецца сінтаксічны статус зваротка, што праяўляецца ў існаванні некалькіх падыходаў да вывучэння граматычнай прыроды яго [2]. Аднак безумоўным з’яўляецца прызнанне таго факта, што зваротак у сказе выконвае важную канструктыўную, а не службовую ролю. Накіраванасць (зварот) змешчанага ў сказе паведамлення да канкрэтнай асобы ці прадмета або з’явы з’яўляецца асноўнай, найбольш істотнай адзнакай зваротка як члена сказа, прызначанага для ўскладнення яго структуры [1, с. 29].

Зваротак як кампанент сказа традыцыйна выконвае намінатыўную, камунікатыўную і эмацыянальна-ацэначную функцыі. Гэта абумоўлена тым, што зваротак, абазначаючы асобу ці прадмет, якім адрасавана выказванне, характарызуе іх, змяшчае пэўную ацэнку, акцэнтуе ўвагу на змесце выказвання і г.д.

Асобы, да якіх адрасуецца зварот у разгледжаных выбраных вершах паэта, называюцца па імені, прозвішчы, роднасці, адносінах да іншых людзей, родзе заняткаў, сацыяльнай прыналежнасці, узроставым і фізіялагічным стане, пэўнай вызначальнай прыкмеце і інш., прычым маўленне можа быць звернута як да адушаўлёных істот, так і (пры персаніфікацыі) да неадушаўлёных прадметаў, геаграфічных назваў, абстрактных паняццяў, прыродных рэалій: *Ці ўсе спяць,* ***Анэта****?; – Шчаслівы ты, што можаш Галатэю У мармуры стварыць,* ***Пігмаліён****;* ***Дон Гавэнда****, прачытаў я Вашы кнігі…;* ***Мама****, дзе мой сон?.. – Спі,* ***дачушка****, Не забудзе твае вочы ён; – Добра, што ты,* ***ўнучачка****, Стараешся памагчы мне…; Што табе я,* ***сяброўка мая****, Толькі шэрыя будні прынёс…; Увайшоў веставы: – да вас,* ***генерал****, перабежчык!; А мы не збіліся з дарогі,* ***праваднік****, Блукаючы па горным бездарожжы?; О* ***свяцейшая высокасць****, Вы даруйце, што я славіць Буду ў грэшнай сваёй одзе Ваша імя, вашы справы; І даверыла б маім ты рукам,* ***дзяўчына****, Ў час начны аберагаць сон твой і спачынак…; Ой, не хавайце вочы За веер,* ***сіньярыта****, Я вас прашу, малю; Што ж вы,* ***хлопцы****, змоўклі ля парога?; Ты лепш пакліч мяне,* ***красуня****, Хоць на хвілінку да сябе…;*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– *Каго, **мудрэц**, шукаеш з ліхтаром?; Не спыняйцеся, **ногі**, на пад’ёмах і схілах…; О, не пакідай мяне, **смех**: Ты нам дорыш светлае шчасце…; Толькі нічога забыць не змагла ты, **Памяць мая**!; Дык што ж мяне клічаш, **дарога**, заўсёды?; Прывет, **пяціглавы Бештаў**! Ты бачыў нямала…; Колькі склалі гімнаў Пра цябе, **Гранада**!; Я даўно з табой, **Нёман**, Пагутарыць марыў; Люблю твае, **Нарач**, затокі і тоні*.

Выяўленыя ў вершаваных радках Максіма Танка звароткі маюць неразвітую (выражаюцца адным самастойным словам) і развітую (выражаюцца некалькімі самастойнымі словамі) структуру. Неразвітыя звароткі прадстаўлены ў большасці сваёй назоўнікамі ў форме назоўнага ці былога клічнага склону або субстантываванымі часцінамі мовы: *Не адступай, **брат**, у змаганні, Ідзі далей, як ты ішоў!; Я вось дажну паласу, **сіраціна**, І раскажу пра палёт матыліны; Ведаю, **песні**, вам хочацца новых прастораў…; Таму і мне ў час развітання Пяро з грамніцай дайце, **дзеці**…; Дык для каго будуеце, **панове**, Канцлагеры, катоўні і астрогі?; Бачыш: у нас голад, жыць нялёгка, **браце**…; Табе яшчэ шмат вінен, **чалавеча**…; Не плач і не бядуй, **стары**!*

Варта адзначыць, што выкарыстанне назоўнікаў клічнай формы з канчаткамі -*у*, -*е*, -*а* (*сынку, лесе, сыне, пане, Сакраце, дружа, казача* і інш.) даволі часта сведчыцца ў вершах Максіма Танка, што спрыяе стварэнню адметнага эмацыянальнага фону і выражэнню даверлівых адносін да адрасата.

Назіраюцца адзінкавыя выпадкі ўжывання ў якасці зваротка і назоўніка *дзеткі*, якім карыстаюцца людзі старэйшага ўзросту пры звароце да маладзейшых асоб. *Такое простае тлумачэнне Нябожчыцы бабкі Ульяны: – Гэта, **дзеткі**. Адначасна плачуць, сустрэўшыся, Зіма, як я, ад старасці І вясна – ад радасці*. Дадзеная форма, пашыраная ў беларускіх народных гаворках, стала адметнасцю вершаваных радкоў паэта.

Зрэдку неразвіты зваротак прадстаўлены займеннікам 2-ой асобы адзіночнага ліку *ты*, што дазваляе прадэманстраваць дастаткова фамільярны зварот да адрасата: – *Ну, а **ты**? – Спыталі ў мяне*.

Развітыя звароткі, як правіла, даюць больш поўную характарыстыку асобе ці прадмету і структурна арганізаваны са спалучэнняў назоўнікаў і залежных ад іх слоў, што дазваляе выказаць абсалютна любыя мадальныя адценні: – *Нашто ты пра гэта мне ўспомніў, **Далёкі вандроўнік**?!; Непакой за цябе, **зямля мая**, За твой ураджай, спакойны сон…; Я вам, **мае дзеці**, пакідаю Самы даражэйшы скарб на свеце…; Нашто, **ўсемагутны Шыва**, Табе столькі лішніх рук?; Ну дзе ж сягоння, **родны горад**, Мяне прытуліш*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*без начлегу?; А прыслаў партрэт мне, і я ледзь пазнаў – Хто цябе,* ***мой дружа****, так намаляваў?!; Як жывецца,* ***бабуля Агата****?*

Заўважаюцца выпадкі выкарыстання і шматкампанентных развітых зваротkaў: *– Спі, засні,* ***маленькі, родненькі саколік****!; Не забывай,* ***мой брат закуты****, У казематах мусіш ты Пiліць і рваць стальныя путы…; Гэй,* ***песняры з салаўінымі песнямі****…; О* ***бронзавае люстэрка З грабніцы старой ці кургана****, Скажы мне: якая глядзела Ў цябе чараўніца-дзяўчына…;* ***Любы дружа, Альда Севярыні****, Колькі год прайшло ад нашай стрэчы…; Мала змянілася,* ***вёска мая ты****!; Ты іх чуеш,* ***мой далёкі дружы****, Ці помніць іх твая радзіма?*, якія выконваюць больш выразную ацэначна-характарыстычную функцыю.

Паводле ўжывання зафіксаваныя ў паэтычных радках звароткі кваліфікуюцца як адзіночныя (*– Калі прыйшоў ты,* ***ягамосць****, Дык пі! – яму сказаў*), паўторныя (***Літва, Літва****! Як мне не паўтараць Тваё імя, што стала родным гукам*) і групавыя (*Эх,* ***скрыпачы з салаўінымі песнямі, Хлопцы, дзяўчаты мае, маладзіцы****!*), прычым выкарыстанне двух апошніх тыпаў абумоўлена, як правіла, неабходнасцю ўзмацнення іх эмацыянальнай выразнасці. У гэтым выпадку зваротак размяшчаецца ў пачатку сказа, што звязана з неабходнасцю яго лагічнага выдзялення ў структуры сказа.

Відавочна, што ступень эмацыянальнасці выказвання танкаўскіх радкоў дасягаецца не толькі за кошт выкарыстання пры звароткu выклічнікаў (часціц) або паўтору яго, але і шляхам ужывання назоўнікаў-зваротkaў з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі. Дадзеная з’ява сведчыцца пры выкарыстанні ў ролі зваротkaў найменняў, што абазначаюць назвы роднасных адносін (*дзядуля, бабуля, матуля, дачушка, сынок, унучачка*). Такім чынам аўтар мае магчымасць выказаць сваю любоў і шчырыя пачуцці да самых блізкіх людзей.

Прааналізаваны матэрыял дазваляе сведчыць не толькі пра адметнасці граматычнага выражэння зваротkaў у вершаваных тэкстах, але і пра тое, што зваротак – важны сродак эмацыянальна-ацэначнай характарыстыкі адрасата, выкарыстанне якога дазваляе падкрэсліць непаўторнасць паэтычнай манеры Максіма Танка.

Літаратура

1. Бурак, Л.І. Зваротак у беларускіх жніўных песнях / Л.І. Бурак / Веснік БДУ. Сер. 4. – 1994. – № 3. – С. 28–33.

2. Капцюг, І.У. Сінтаксічныя ўласцівасці зваротка: гістарыяграфічны аспект / І.У. Капцюг / Весці БДПУ. Сер. 1. – 2005. – № 2. – С. 65–68.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Каўрус, А.А. Танк Максім / А.А. Каўрус / Беларуская мова : энцыкл. ; пад рэд. А.Я. Міхневіча ; рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мінск, 1994. – С. 553–556.
4. Танк, М. Выбранае : вершы / М. Танк ; прадм. В. Зуёнка. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 335 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ